**А. І. Маруціч, В. Д. Фіцкевіч**

# АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНАЙ ШЧАСЛІВАЙ КАНЦОЎКІ

Існуе некаторая колькасць варыянтаў канцоўкі твора. Выбар, як правіла, залежыць ад ідэі аўтара, жанравых асаблівасцяў твора і запланаванага ўплыву на чытача. З маштабнага пункту гледжання, можна вылучыць некалькі асноўных відаў канцовак: адкрытая, дзе чытачам даецца магчымасць падумаць наконт далейшых падзей самастойна; закрытая, дзе аўтар сам цэласна заканчвае твор без магчымых ідэй чытачоў; з цікавым паваротам, дзе аўтар наўмысна падманвае чытача напрацягу ўсяго твора, не даючы адразу здагадацца, чым усё закончыцца.

Аднім з найбольш тыповых варыянтаў канцоўкі літаратурнага твора традыцыйна з'яўляецца так называемая шчаслівая канцоўка, або *'happy ending'*. Калі гаворыцца пра падобны від, то ўзгадваюцца некаторыя характэрныя рысы. Зазвычай галоўны герой у канцы гісторыі не ведае бедаў, а, наадварот, атрымлівае заслужаную ўзнагароду за пройдзеныя цяжкасці. У выпадку, калі ў творы прысутнічае лінія кахання, яна, як правіла, суправоджваецца лозунгам "і жылі яны доўга і шчасліва". Антаганіст, які можа выступаць і галоўным злодзеем, абавязкова плаціцца за свае ўчынкі, а другасныя персанажы ціха радуюцца за пратаганістаў. Акрамя таго, аўтар абавязкова дасць зразумець, што ўсё добра яшчэ і праз агульныя абставіны: надвор'е добрае, сонца вызірае з-пад хмар, ни намёка на дождж, а калі ён і быў, то пасля яго з'яўляецца вясёлка, тэмпературны камфорт, сады квітнеюць, зіму замяняе вясна. Паўсюль чысціня і ўтульнасць, кожная дэталь на сваім месцы, час запавольваецца.

Напрыклад, у аповедзе О. Генры *"The Gift of the Magi"* можна прасачыць адпаведнасць пэўным канонам шчаслівай канцоўкі. Па сюжэце два пратаганісты, муж і жонка, ахвяруюць самымі дарагімі рэчамі ў іх доме, каб парадаваць адзін аднаго і набыць значныя падарункі адзін аднаму на Раство. Можна ўявіць, з якімі цяжкасцямі праз пазбаўленне такіх рэчаў ім прыйшлося б стаўкнуцца наперадзе. Але галоўнае, што намагаецца сказаць аўтар, гэта тое, што радасць залучаецца не ў матэрыяльных каштоўнасцях, але ў радасці,

якую чалавек прыносіць адзін аднаму. Нават апошні абзац аповеда напрамую кажа што, магчыма, гэта ўсё і было глупствам, але тым не менш героі застаюцца шчаслівымі.

Можна заўважыць, што ў дадзеным выпадку чытачам нават не прыходзіцца разважаць наконт парадаксальнасці феномена шчасця, а наадварот: аўтар дастаткова прамалінейна падкрэслівае шчасліваe заканчэнне ўсіх неадназначных сітуацый, з якімі сутыкаюцца яго персанажы, тым самым абнадзейваючы чытачоў у падобным выхадзе іх асабістых жыццёвых іспытаў.

Аднак, з развіццём літаратурнай думкі і змяняемай разнастайнасцю ў прыёмах афармлення сюжэтнай кампазіцыі, а такжа ў сілу культурных і сацыяльных зменаў у грамадстве, адзначаецца пераваладa адкрытай або не такой адназначнай канцоўкі ў кантрасце з традыцыйна шчаслівай.

Так, у аповедзе У. Сомэрсэта Моэма пад назвай *"The Happy Man"* нельга з адназначнасцю сведчыць пра шчаслівую канцоўку. Уяўнае шчаслівым завяршэнне выпрабаванняў галоўнага героя з'яўляецца такім на паверхні, бо чытач сутыкаецца з канфліктам у канцы апавядання. Канфлікт мае на ўвазе маральны выбар героя, Стывенса, паміж рызыкай, якая вядзе да невядомага, магчымага шчасця і стабільнасцю, якая з'ядае ментальны стан героя, што кантрастуе з ідэяй *'happy ending'*. Як вынік, рызыка была абраная, але пошук адказа на пытанне, наколькі шчаслівым застаецца пратаганіст, аўтар дае самому чытачу.

У падобным выпадку адназначна казаць, што падобны канец трапляе пад вызначэнне "традыцыйнага", не даецца магчымым, бо само паняцце шчасця ў момант заканчэння аповеда становіцца адносным. Паводле агульных характарыстык, галоўны герой мусіў застацца разам з сваёй жонкай, што б сведчыла пра каханне, якое не паб'е ніякае гора, а на новым месцы, акрамя сонца і добрага настрою, іх чакала б і фінансавая стабільнасць. Але наадварот, герой разводзіцца з жонкаю, пытанне грошай ніколі не рашаецца канчаткова, а з агульна прынятых рэчаў застаецца сонца звонку і спакой унутры.

У кантэксце сучаснай прозы сітуацыя з паняццем "шчаслівай канцоўкі" становіцца яшчэ менш адназначнай. Аповед Мэйв Бінчы *"The Garden Party"* прапаноўвае дзве крайнасці, метафарычна адлюстраваныя праз сады гераінь. Гераіня Дэббі на першы позірк, жыве без праблем, абжыты, чысты і упрыгожаны сад каторай служыць своеасаблівым сімвалам душэўнага спакою і гармоніі. У іншай галоўнай герíні, Хэлен, неўладкаванасць асабістага жыцця адлюстравана ў недагледжанасці новага сада, непрыбранасці дома, нераспакаваных пасля пераезда скрынях. Паводле аповеду чытач разумее, што абедзве гераіні маюць цяжкія гісторыі, а іх рашэнні нясуць даволі спрэчную прыроду. І ў рэшце рэшт, шчаслівая, але пастаўленая адкрытай, канцоўка не дае упэўненасці ў безумоўным шчасці ніводнай з пратаганістак.

Сыходзячы з агульных рысаў *'happy ending'*, можна адзначыць, што аўтар усё ж дае намёкі на такую канцоўку: аповед заканчваецца падрыхтоўкай да вечарыны-наваселля, навядзеннем парадку ў запушчаным садзе пад

спевы птушак і сонечным святлом, якое прабіваецца скрозь зялёныя галіны раслін. Але відавочна, што гераіні засмучаны і ім ёсць наконт чаго падумаць, бо сродкам таго самага шчасця бачыцца выкарыстоўванне пачуццяў іншых людзей, што з маральнага пункту гледжання не дае поўнага права называць такую канцоўку абсалютна добрай. Менавіта такая парадаксальнасць становіцца пераважнай сярод аўтараў сучаснай прозы вялікай і малой формаў.

Кожны з трох аповедаў па-свойму ўнікальны, але яны дазваляюць прасачыць за зменамі ў звычках спажывання чытачоў, што дае магчымасць чакаць далейшыя навіны ў запытах. Нельга не адзначыць, што ў канцы дзевятнаццатага стагоддзя ў аўтараў, напрыклад, у вышэй узгаданага О. Генры, таксама былі сюжэтныя канцоўкі, якія ідуць у адрозненні ад канвенцыйна шчаслівай, тым часам як і ў дваццаць першым стагоддзі ні аднойчы можна заўважыць заканчэнні твораў з усімі клішэ, якія пасуюць вызначэнню шчасця. На нашую думку, самым каштоўным у развіцці творчай думкі пісьменнікаў з’яўлецца іх бесперапыннае развіццё, якое дае чытачам магчымасць здзіўляцца і шукаць новыя сэнсы ў сучасным свеце, які бясконца хутка зменьваецца. Не існуе канцоўкі “правільнай” або “няправільнай”, “цікавай” або “нецікавай”, трэба памятаць, што мае месца быць выключна асабістае меркаванне чытача і, галоўнае, задумка аўтара.

Такім чынам, канцоўка аўтараў дваццатага стагоддзя, якой аддаецца перавага, меркавала рысы ўсеагульнапрынятага шчасця, якое выражалася ў душэўным спакоі, эканамічнай стабільнасці, здзяйсненні мрояў і пераадольванні жыццёвых цяжкасцяў. Панаваўшая ў тую эпоху нестабільнасць у палітычным, эканамічным і сацыяльным планах пры захоўваемай надзеі на светлую будучыню і толькі пачаўшаму свой зародак метад псіхааналізу адлюстроўвае цікавасць чытача да падобнага віда канцоўкі. Агульнапрынятыя нормы маралі не спрыялі пераваладанню запроса чытачэй на неадназначнасць і складанасць у трактоўцы. Ствараемая аўтарам надзея праз дабрабыт галоўных герояў, чароўнае надвор’е, атрыманне пакарання за дрэнныя ўчынкі і прыклад рашэння праблемаў наадварот, спрыялі імгненнаму задавальненню цікавасці чытачэй і падтрымлівалі веру чалавека ў светлую будучыню і паспяховага пераадолення ўсіх жыццёвых іспытаў. Канец дваццатага і пачатак дваццаць першага стагоддзяў былі азнаменаваныя не меншай колькасцю зменаў у звычайным ладзе жыцця людзей з той толькі розніцай, што накоплены папярэднімі дзесяцігоддзямі досвед выходзіў вынікам у такой якасці ментальнасці чытача, якая б дазволіла яму цаніць, чакаць і нават патрабаваць складанейшую, неадназначную, спрэчную канцоўку. Цяпер жа, чытач дваццаць першага стагоддзя хутчэй абярэ больш парадаксальную канцоўку, якая спрыяе танчэйшаму разважанню. Гэта звязана з хуткім развіццём навакольнага свету, перанасычанасцю падзей і, галоўнае, ўнутраным жаданнем быць здзіўленым. Тым жа часам, нельга адмаўляць патрэбу і ў шчаслівых, простых канцоўках, якія усё яшчэ знаходзяць свайго чытача ў сілу лёгкасці ва ўспрыняцці і інтэрпрэтацыі звычайнасці, прадказальнасці абставінаў і іх пераадольванняў. Трэба

адзначыць, што адданне перавагі традыцыйнай канцоўцы, а не яе неадназначнаму варыянту, прадыктавана хутчэй жанравымі асаблівасцямі твора, чым масавым запросам публікі.